Вучэбная дысцыпліна “Гісторыя беларускай журналістыкі”

| Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы | Адукацыйная праграма бакалаўрыяту<br>(І ступень вышэйшай адукацыі)<br>Спецыяльнасць: **6-05-0321-01 Журналістыка**<br>Дзяржаўны кампанент<br>**Гісторыка-журналісцкі модуль** |
|---|---|
| **Кароткі змест** | Неперыядычныя друкаваныя выданні газетнага тыпу на тэрыторыі Беларусі XVI – пачатку XVII ст. Перыядычныя выданні на тэрыторыі Беларусі XVII – XVIII стст. Фарміраванне нацыянальнай ідэі і журналісцкая справа на беларускіх землях у першай палове XIX ст. Беларуская журналістыка пачатку XX стагоддзя (1905–1917 гг.). |
| Фарміруемые кампетэнцыі, вынікі навучання | Базавыя прафесійныя кампетэнцыі: ***ведаць:*** гісторыю стварэння нацыянальнай прэсы; асноўныя дасягненні беларускай публіцыстыкі ў дынаміцы яе гістарычнага развіцця; уплыў беларускіх выданняў на развіццё дэмакратычнай грамадскай думкі; значэнне беларускага друку ў працэсе фарміравання беларускай нацыі, дзяржаўнасці; ***умець:*** характарызаваць прычыны, умовы ўзнікнення беларускіх перыядычных выданняў; ажыццяўляць параўнальны аналіз друкаваных выданняў, ацэньваць грамадска-палітычнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае значэнне іх дзейнасці; аналізаваць працэс станаўлення беларускай журналістыкі; вытлумачваць уплыў розных сацыяльных, эканамічных, культурных і палітычных фактараў на фарміраванне нацыянальнай прэсы; прымяняць гістарычныя веды ў прафесійнай дзейнасці; ***валодаць навыкамі:*** выкарыстання гістарычнага вопыту беларускай журналістыкі ва ўласнай прафесійнай дзейнасці; практычнага выкарыстання ведаў пра асаблівасці развіцця нацыянальных СМІ і інфармацыйнага грамадства на сучасным этапе. |
| Прэрэквізіты | Гісторыя беларускай літаратуры. |
| Працаёмкасць | 3 заліковых адзінкі. Агульная колькасць гадзін – 116; аўдыторных гадзін – 68, у тым ліку лекцыйных – 24 гадзіны, практычных – 44 гадзіны. |
| Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі | 6 семестр экзамен, калоквіум, тэст. |